ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

23 ЛІСТАПАДА 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 22 (15966)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

Хелена МЕРААІ:

# «Пры ўсёй магіі тэлебачання важна заставацца сабой»



**Яна — таемны агент «Дзённікаў шоу Фактар.by», вядучая маладзёжнага праекта «ПІН_КОД» на тэлеканале «Беларусь 2» і проста прыгожая, творчая дзяўчына. Верыць, што шчаслівымі патрэбна быць найперш для саміх сябе, і, напэўна, натхняе многіх глядзець на жыццё нестандартна і крэатыўна. Пра тое, ці ўбачым мы яшчэ Хелену Мераaі на сцэне як спявачку, ці спазнала яна ўжо канчаткова магію тэлебачання і чым захапляецца сёння, даведаліся ў нашай гераіні пры сустрэчы.**

***— Як вам у ролі сакрэтнага агента на шоу «Фактар.by»?***

— Часцей за ўсё «Дзённікі» ў нас пяціхвілінныя, але здараецца, што хронаметраж змяняецца, бо вельмі хочацца распавесці пра тое, што адбываецца за кадрам праекта. А гэта вялікі аб'ём матэрыялу, хоць і рэжам часам яго бязлітасна. Аднак вельмі хочацца перадаць той настрой і атмасферу, якія пануюць на здымачнай пляцоўцы. І з кожным сезонам, лічу, нам усё лепш тое ўдаецца. У першым сезоне шоу (тады яно яшчэ называлася «Х-фактар. Беларусь») я знаходзілася за кадрам, а ў другім сезоне мяне вывелі на экраны, і цяпер працую ў такім фармаце. Але не стаўлю сябе на адну прыступку з вядучымі і настаўнікамі праекта, бо выконваю ролю закуліснага мадэратара. Імкнуся быць для ўдзельнікаў на праекце блізкім сябрам, з якім можна паплакаць і пасмяяцца. Бо на такога кшталту праектах падтрымка вельмі важная для кожнага, хто выходзіць на сцэну. Я гэта ведаю па ўласным вопыце. І таму, як ніхто іншы, разумею іх перажыванні і эмоцыі.

***— Дзе працаваць цікавей: у кадры ці за ім?***

— Мне заўсёды падабаецца адкрываць новае, бо тады ўзнікае жаданне ўсё разгледзець, унікнуць у сутнасць. Так, з задавальненнем займаюся як мантажом, люблю пісаць сцэнарыі, так і працую ў кадры. І апошняе, мабыць, усё ж пераважае, бо дае магчымасць радаваць іншых. Хаця, калі працуеш на мантажы, то там можна назіраць за сапраўдным цудам, як усё ў кадры перайначваецца, прычым можна зрабіць як лепш, так і горш. Альбо паламаць, альбо стварыць з нічога штосьці па-сапраўднаму прыгожае. Там безліч граняў. Вядучы — гэта ўжо праца, дзе часам даводзіцца быць самой і стылістам, і грымёрам, што таксама дае прастору для самавыяўлення. Таму ў праектах, дзе я задзейнічана сёння, магу рознабакова шукаць сябе.

***— Магія тэлебачання для вас у чымсьці яшчэ засталася?***

— Не магу сказаць, што на тэлебачанні можна ўсё спазнаць. Ёсць рэчы, якія, можа, заўсёды для мяне будуць неспасцігальныя, бо часам трэба змірыцца, што гэта працуе так і не інакш. Калі я прыйшла на тэлебачанне, то мне гаварылі, што гэта сфера, якая ў нейкі момант проста не адпускае людзей. Яны жывуць на працы. А цяпер я пражываю ўсё гэта сама, без свят, выхадных і адпачынку. Так, мы жывыя людзі, і часам нам цяжка, але на такія ахвяры мы ідзём дзеля саміх сябе. І калі хочаш нечага дасягнуць у гэтай прафесіі ці ў нейкай з тых, дзе ёсць творчасць, то спрацоўвае толькі такі варыянт. Свет і яго пабудова там спазнаецца праз самаахвярнасць, рэгулярныя трэніроўкі. Працэс гэты бясконцы, і ты пастаянна нешта «капаеш» і вывучаеш новае. Напрыклад, я працую з многімі шэф-рэдактарамі, якія мяне накіроўваюць. І бачу, колькі яны ўсяго глядзяць, каб развівацца, хоць і таленавітыя, і ўжо не адзін маштабны праект зрабілі.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Лакацыі актыўнасці

# За патрыятызм і бяспеку — разам

**Міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ і першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ падпісалі Пагадненне аб узаемным супрацоўніцтве. Яго абнаўленне і падпісанне абумоўлена цяперашнімі рэаліямі, дзяржаўнай маладзёжнай палітыкай у галіне грамадзянскага і патрыятычнага выхавання моладзі, навучання яе асновам бяспекі жыццядзейнасці.**

Прадугледжваецца, што ратавальнікі на базе сваіх тэрытарыяльных падраздзяленняў навучаць моладзь метадам папярэджання пажараў, надзвычайных сітуацый, правілам пажарнай бяспекі, а таксама спосабам і метадам работы з людзьмі па прапагандзе бяспекі жыццядзейнасці, а таксама акажуць у рамках сваёй кампетэнцыі садзейнічанне і падтрымку ў пытаннях, якія ўзнікаюць.

Акрамя таго, бакі будуць узаемадзейнічаць пры распрацоўцы і правядзенні мерапрыемстваў, акцый, конкурсаў і іншых сацыяльных праектаў, накіраваных на прапаганду бяспекі жыццядзейнасці, прапаганду пажарна-ратавальнага спорту, здаровага ладу жыцця, дабрачыннасці, актыўнай стваральнай грамадзянскай пазіцыі і патрыятызму.

Цяпер у сістэме МНС функцыянуе 156 пярвічных арганізацый БРСМ, якія аб'ядноўваюць больш як пяць тысяч членаў. Штогод праводзіцца шэраг значных мерапрыемстваў і акцый, такіх як «Адзін дзень з МНС», «Не пакідайце дзяцей адных!», «Бяспека ў кожны дом», «Канікулы без дыму і агню», «Моладзь — за бяспеку», «Не прапальвай сваё жыццё!», «Бяспечны Новы год», «Да абароны Айчыны гатовы!», «Дзень Бяспекі», «Бяспека ў нашых руках», «У школу з Добрым Сэрцам!», «У цэнтры ўвагі — дзеці!», «Моладзь — за чысты горад», «Моладзь — за бяспеку і правапарадак», «Праспяваем гімн разам!», «Летні патруль». Таксама сёлета ў Дзень народнага адзінства, які падкрэслівае пераемнасць пакаленняў, непахіснасць і самадастатковасць беларускай нацыі і дзяржавы, праведзены велапрабег «Адзінствам моцная Беларусь».

У МНС удзяляецца вялікая ўвага развіццю моладзі і навучанню яе правілам бяспечных паводзін, навыкам дзеянняў у надзвычайных сітуацыях. Арганізацыяй, якая дае магчымасць аб'ядноўвацца на аснове сумесных інтарэсаў для вывучэння асноў бяспекі жыццядзейнасці, стала Беларуская маладзёжная грамадская арганізацыя ратавальнікаў-пажарных.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прафарыенцір

# АД МАШЫНАБУДАВАННЯ ДА КУЛІНАРЫІ І ДЫЗАЙНУ

**Якую адукацыю выбраць: сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную? Пасля дзявятага класа ці пасля адзінаццатага? А можа быць, накіравацца ў ВНУ? Перад такім выбарам стаяць шмат выпускнікоў.**



## ПРАФЕСІЙНАЯ ДЫЯГНОСТЫКА

— Нягледзячы на тое што на дварэ яшчэ лістапад, будучым абітурыентам ужо варта задумацца аб выбары далейшай прафесіі, — раіць **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі, начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА**. — Рэкамендую прайсці прафесійную дыягностыку. У гэтым дапаможа сістэма «ПрофіТэст», створаная Рэспубліканскім інстытутам прафесійнай адукацыі якраз для гэтых мэт.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*